*Д. В. Барсукоў*

# БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ: АРТ-ПРАЕКТ «ТРАНСФАРМАЦЫЯ. ДПМ 2010»

Працэсы глабалізацыі, якія ідуць па ўсім свеце, не абмінаюць, безумоўна, і Беларусь [2]. Закранаюць яны і беларускае мастацтва [1], і нават такое кансерватыўнае па духу, як традыцыйнае дэкаратыўна-прыкладное.

Восенню 2010 г. у нашай краіне праходзіў рэспубліканскі фестываль сучаснага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Зямля пад белымі крыламі». Адной з падзей гэтай маштабнай акцыі стаў маладзёжны выставачны праект мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» «ТРАНСФАРМАЦЫЯ. ДПМ 2010». На прыкладзе твораў удзельнікаў гэтага праекта – студэнтаў і выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і іншых навучальных устаноў – добра прагледжваецца ўздзеянне глабалізацыі на маладзёжнае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Асноўная ідэя выставачнага праекта «ТРАНСФАРМАЦЫЯ. ДПМ 2010» – прэзентаваць грамадскасці стан і асноўныя тэндэнцыі развіцця творчасці новага пакалення творцаў беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, паказаць той уплыў глабалізацыі, што адбіваецца на іх творчасці. Змены мастацкіх прыёмаў і творчага мыслення маладых мастакоў натуральныя і заканамерныя, бо зараз радыкальна змяніліся эканамічныя, сацыяльныя і побытавыя акалічнасці свету, у якім існуе творчая моладзь. Сённяшняе жыццё вельмі адрозніваецца ад жыцця нашых продкаў, якія ў свой час стварылі традыцыйнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў тым выглядзе, у якім мы яго зараз ведаем, якім па праву ганарымся. У той жа час мастацкі працэс нельга спыніць толькі на рэстаўрацыі і рэканструкцыі здабыткаў мінулага. Сучаснасць стварае новую мастацкую рэчаіснасць, новыя ўмовы існавання мастакоў. Істотна змяніўся рытм нашага жыцця, з'явіліся новыя матэрыялы і тэхналогіі, новыя магчымасці рэалізацыі сваіх ідэй. Таму натуральна, што менавіта маладыя мастакі адказваюць на выклікі часу і ствараюць сучаснае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У асноўным прадстаўленыя ў экспазіцыі выставачнага праекта «ТРАНСФАРМАЦЫЯ. ДПМ 2010» творы магчыма падзяліць на тры ўмоўныя тыпы. Работы першага прадстаўляюць працу аўтараў у сферы больш традыцыйнага разумення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, шукаючы новыя метады работы з формай, арнаментам, фактурай у эвалюцыйным напрамку.

Напрыклад, гэта выхаванцы майстэрні керамікі кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Дзяруга Наталля («Паветрык»), Руско Андрэй («Бясконцасць»), Аляксеева Вольга («Ля зорак»), Каралёва Таццяна («Галаснікі») і інш. У гэтым жа кірунку працуе малады кераміст Максім Калтыгін, работа якога – «Кветка» – уражвае выбітнай формай, вытанчанай пластыкай, дакладным спалучэннем дэкору і фактуры.

Другі тып прэзентаваны работамі, аўтары якіх знаходзяць новае ўжыванне традыцыйным тэхнікам, напаўняючы іх новым ідэйным зместам.

Яскравым прыкладам гэтага тыпу служаць арт-аб’екты з саломкі студэнткі кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Мешчараковай Вольгі. Саламяныя кіпяцільнік і электралямпа «У мэтах эканоміі сродкаў і электраэнергіі», саламянае веласіпеднае кола з крыльцамі «Імкненне да дасканаласці», вулей з пчоламі і нават саламяны туфлік «Інфузорыя». Або канцэптуальны роспіс па шкле Саяпінай-Гендрусевай Надзеі «Тры дзікія мядзведзі», дзе аўтар уключае ў традыцыйную народную тэхніку спадчыну заходнееўрапейскага жывапісу XIX–XX стст. Ці керамічны сінтэз біялагічнага і тэхнагеннага выпускніка кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Алега Ткачова «Насякомае». Таксама выразна праглядваюцца прыкметы глабалізацыі і ў керамічным камплекце «Англійскае снеданне» выпускніцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рудзеня Вольгі. Разнастайныя вытанчаныя трансфармацыі фарфоравых кубачкаў, чалавечых фігурак, трубак, загадкавых знакаў, брытанскіх сцяжкоў і англійскіх тэкстаў на фоне фотавідаў Лондана ствараюць фантастычныя вобразы знакамітага «Five o’clock». Дарэчы, тэма чаяпіцця развіваецца і ў нечаканым мастацкім вырашэнні Аждзер Наталлі – чайніку з лямцу (з той жа назвай), і ў рабоце Жахаўца Уладзіміра «Мегаполіс» – чайніку з фрагментаў абпаленай гліны, звязаных паміж сабой шнурамі, цікавым вобразе існавання людзей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у сучасным горадзе і таго, што іх лучыць у адзіны ўрбаністычны арганізм. Супярэчлівасці працэсу змены традыцыйнай культуры на глабальную адлюстраваліся ў канцэпцыі кампазіцыі з мастацкага шкла выпускніцы Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Атрашкевіч Алены пад назвай «Бітва вентылятараў».

Трэці тып прадстаўлены адносна невялікай па колькасці, але паказальнай па сутнасці групай работ. Вызначальнай адметнасцю твораў гэтага тыпу з'яўляецца выкарыстанне нетрадыцыйных матэрыялаў. Напрыклад, гэта дзве серыі арт-аб'ектаў выпускніцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка Гомза Таццяны «Стракоптыка» і «Рыбны дзень» – работы, створаныя з рэшткаў тэхнасферы. Серыя арт-аб'ектаў Сілівончык Ганны – сінтэз сапраўдных вокнаў, жывапісу і паэтычных тэкстаў. Арт-аб'ект Сташулёнак Маргарыты «Новая сукенка для інфанты» створаны з шуфлядкі. Арт-аб'ект «Саксафон (матэрыялізацыя музыкі)» выпускніцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Барысенка Марыі створаны ў тэхніцы габелена з выкарыстаннем нетрадыцыйных матэрыялаў: пластыкавых нітак, святлодыёдных шнуроў, рэштак музычнага інструмента. Прылуцкая Надзея і Моніч Аляксандр прадставілі арт-аб'ект «FORM» з дрэва, паперы, вуглёў і жывой травы.

Прадстаўленыя ў экспазіцыі выставачнага праекта работы прадэманстравалі схільнасць маладых мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва да адыходу ад утылітарнага ў сваёй творчасці. Прыкладныя функцыі яны пакідаюць прамысловаму дызайну, рухаючыся ў напрамку чыстага мастацтва. Адчуваецца ўплыў сучаснага мастацтва на творчасць маладых, іх накіраванасць на эксперымент, увядзенне ў традыцыйную форму новых зместаў і сэнсавых акцэнтаў.

«ТРАНСФАРМАЦЫЯ. ДПМ 2010» навідавоку прадставіла ўплыў глабалізацыі на творчасць маладых мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, асэнсаванне імі культурнай спадчыны, народных традыцый у сучасным кантэксце, а таксама на погляды новай мастацкай фармацыі на развіццё дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі.

1. *Конан, У. М.* Аўтэнтычная народная культура ва ўмовах глабалізацыі / У. М. Конан // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 4. – С. 60–64.

2. *Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М.: АСТ, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ